БРЫЛЕЎСКІ ЛЕТАПІС

№ 26 (73)
верасень
2008 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца
з мая 2006 г.

верасень. Бульба,

с.3

КАМУНІКАТ.ОРГ

Улада с.2 Гандаль с.4 Сход с.5

Зіма патрабуе падрыхтоўкі

24 верасня 2008 г. адбылося чарговае паседжанне выканкама Брылеўскага сельсавета. Галоўнае пытанне павесткі дня -- аб стане падрыхтоўкі да ацяпляльнага сезона.

Старшыня выканкама Уладзімір Ільіч Мажораў паведаміў, што 23 верасня быў выканкам райсавета, дзе разглядалася аналагічнае пытанне. Раён у асноўным да зімы падрыхтаваны. Тое ж самае можна сказаць і пра Брылеўскі сельсавет: усе ўстановы маюць пашпарты гатоўнасці да ацяпляльнага сезона, дровы завезеныя, сістэмы адрамантаваныя. У Макаранцах ужо пачалі атапліваць дзіцячы сад і ФАП. Насельніцтва забяспечана палівам практычна на 100% -- заявы разглядаюцца неадкладна. Ёсць пытанне наконт шматдзетнай брылеўскай сям'і Ірыны і Генадзя Пшанічных, але тут патрабуецца, каб самі Пшанічныя прыклалі адпаведныя намаганні ў справе нарахтоўкі дроў для сябе, бо магчымасці такія ў іх ёсць.

Таксама У.І.Мажораў акрэсліў пытанні рамонту дарог, калодзежаў, брылеўскай грамадскай лазні і падрыхтоўкі да Дня пажылога чалавека.

Галоўны заатэхнік УКАП "Фірма "Днепр" Валянцін Іванавіч Лапшыноў паведаміў, што ў асноўным гаспадарка да зімы падрыхтавалася. Ідзе рэканструкцыя вытворчых памяшканняў: у Брылях будуць свінарнікі, у Качурына ў памяшканні № 7 будзе ўсталявана камп'ютарная сістэма дагляду за статкам. Таксама на качурынскім мехдвары будзе працаваць асфальтавы завод. Што тычыцца самой гаспадаркі, то ёсць планы па далучэнні да фірмы "Днепр" сухарэўскіх і зарасцянскіх палеткаў. І ідзе інтэнсіўная падрыхтоўка да акцыяніравання фірмы.

Загадчыца Брылеўскага ФАПа Алеся Ўладзіміраўна Аляксейкова звярнула ўвагу на тое, што трэба дапамагчы з палівам В.І.Рамашкевічу. У. І. Мажораў прапанаваў стварыць камісію па абследванню гэтай вясковай сядзібы.

Дырэктар Брылеўскай школы-сада Наталля Анатольеўна Ярмаш, дырэктар Брылеўскага СДК Мікалай Адамавіч Яцкоў праінфармавалі аб гатоўнасці сваіх устаноў да ацяпляльнага сезона.

Таксама Н.А.Ярмаш прапанавала звярнуцца з пісьмом да кандыдата ў дэпутаты А.І.Разганава наконт рамонту брылеўскай лазні. Гэтую прапанову падтрымала старшыня селькама в.Брылі Тамара Васільеўна Максімчыкава, адзначыўшы, што мы стаім на мяжы, за якой пачынаюцца педыкулёз і іншыя інфекцыі. У. І. Мажораў адзначыў, што прапанова вельмі слушная і трэба яе ажыццявіць у выглядзе наказа будучаму дэпутату Парламента.

Па абмеркаванаму пытанню была прынята адпаведная пастанова. Былі таксама разгледжаны некаторыя іншыя пытанні жыццядзейнасці сельсавета.

М.Я.

У.І.Мажораў

В.І.Лапшыноў

Н.І.Рамашкевіч

А.У.Аляксейкова

А.М.Яцкова


Н.А.Ярмаш

В.В.Ляутка

Т.В.Максімчыкава

КАМУНІКАТ.org

Без бульбы - ніяк...

Верасень, не шкадуючы залатой фарбы, размалёўвае навакольныя палеткі, дзе ўздымаецца новая хваля адвечных сялянскіх турботаў: пачынае “ісці” бульба. А паколькі для кожнага з нас гэты карняплод мае выключна важнае значэнне, то і адносіны да працы з ім адпаведныя -- старанныя і паважлівыя. Так было, ёсць і будзе заўжды.

М.Я.

Міхаіл Спірыдонавіч Чулык разам з сынам Юрыем ідуць у наступ на бульбяным “фронце”.

Паміж бульбай і працалюбівымі жаночымі рукамі заўсёды існавала непарыўная сувязь...

Сяргей Парфененка і Алег Гулакоў задаволены: сёлетні ўраджай “другога хлеба” атрымаўся неблагім.

Яблыкі і стымулы

Могилевское
райпо
закупает от населения
ЯБЛОКО
в неограниченном
количестве
по цене 220 руб/кг

Андрэй Сідзельнікаў, Аляксей Паршнёў, Аляксей Пухоўскі і Кастусь Пшанічны зладзілі чарговы яблычны “дэсант”.

Калі на пачатку верасня вяскоўцы пабачылі ў магазіне вось гэтую аб’яву, то адразу праявілі высокую актыўнасць. І пачаўся шматдзённы няспынны рух яблычных “караванаў” да магазіннага ганка. Зразумела, што ніхто нікога сілком не прымушаў гэтага рабіць, бо тут працавалі звычайныя законы эканамічнай мэтазгоднасці, заснаваныя на прынцыпах асабістай зацікаўленасці. А гэта трывалы падмурак любой дзяржаўнай сістэмы, дзе шануюць асноватворныя законы развіцця грамадства.

Гандаль з колаў

Прыватнік завітаў у Малееўку.

Гандаль на колах -- асноўная форма работы па забяспячэнню прадуктамі харчавання жыхароў невялікіх і аддаленых вёсак, дзе няма стацыянарных магазінаў. Калісьці спрабавалі рабіць крамы "на даму", але з цягам часу перавагу аддалі менавіта аўталаўкам. Сваю дапамогу ў гэтай неабходнай справе аказваюць прыватнікі. Напрыклад, у вёску Малееўка дзяржаўная аўталаўка з хлебам прыязджае па аўторках, а прадпрымальнік свае прадукты завозіць па панядзелках і пятніцах. Жыхары вельмі задаволеныя. У вёску Зылі па раскладу завітвае ўніверсальны аўтамагазін, дзе можна набыць і хлеб, і ўсе іншыя неабходныя прадукты.

М.Я.

Старшыня выканкама Брылеўскага сельсавета У. І. Мажораў вывучае асартымент аўтамагазіна.

Жыхарам вёскі Зылі ёсць што выбіраць з прапанаванага тавару.

ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ

Кіраўніцтва аграфірмы "Днепр" з вялікай павагай ставіцца да ветэранаў былога калгаса імя Ільіча. У чарговы раз у Брылі завезлі танныя памідоры, і прадавец Людміла Мікалаеўна Крутава прапануе іх ветэранам па 500 руб. за кілаграм. Пенсіянерка Галіна Васільеўна Пахарэнка з задавальненнем прымае гэтую прапанову.

Людміла Леанідаўна Бураева, працуючы загадчыцай Брылеўскага буфета, аддае шмат часу справаводству. Кожную дзелавую паперу трэба своечасова напісаць, кожную інструкцыю трэба ўважліва вывучыць. Людміла разумее вялікую неабходнасць "папяровай" часткі сваёй работы, добра арыентуецца ў гэтым моры і імкнецца ніколі не губляць аптымізму.

Шлях да згоды

16 верасня 2008 г. у вёсцы Зылі адбыўся сход жыхароў, прысвечаны надзённаму пытанню, якое на працягу ўжо даволі працяглага часу іх хвалюе -- аб узорванні дарогі, якая ідзе ад вёскі да аўтобуснага прыпынку на сухарэўскай шашы.

Старшыня выканкама Брылеўскага сельсавета **Уладзімір Ільіч Мажораў** акрэсліў сутнасць закранутага пытання і паведаміў аб тым, якія захады робяцца па яго вырашэнню. Старшыня селькама в.Зылі **Уладзімір Андрэевіч Войтаў** звярнуў увагу прысутных на тое, што праблема гэтай дарогі наспела даўно, але кіраўніцтва і аграфірмы "Днепр", і сельсавета не жадае прыслухацца да меркаванняў вяскоўцаў. Свае думкі выказаў намеснік начальніка упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання па раслінаводству Магілёўскага райвыканкама, дэпутат раённага Савета **Сяргей Дзмітрыевіч Ігнаценка**, які прапанаваў у мэтах вырашэння ўзніклай праблемы засеяць тое поле шматгадовымі травамі. Усе пагадзіліся з гэтай слушнай прапановай.

Мікола ЯЦКОЎ.

Сход пачаў сваю работу...

У.І.Мажораў


С.Д.Ігнаценка прапануе...

У.А.Войтаў

Г.В.Уласава і Н.А.Войтава

Р.М.Сяргеенка

Фотаздымкі Міколы Яцкова

Пытанні да кіраўнікоў...

З.С.Сяргеенка

А.Т.Дзенісевіч

Імгненні

Ксенія Мухортава разам са сваёй белай і пушыстай сяброўкай Лізай выйшлі на прагулку. *4 верасня 2008 г.*

Аляксей Паршнёў нават у сціплых вясковых умовах імкнецца на сваіх ролікавых каньках да вышынь спартыўнага майстэрства. *8 верасня 2008 г.*

Уладзімір Сцяпанавіч Майсцер і сучасныя тэхналогіі. *17 верасня 2008 г.*

Карына Бірукова разам з аднакласнікамі і Наталляй Анатольеўнай Ярмаш прыбіраюць ля помніка.

Даволі рэдкая з'ява назіралася 20 верасня: па Качурыну і Брылях пераганялі вялізны калгасны статак.

Брылеўская бібліятэка інфармуе...

№ 5, 2008 г.

Часопіс "Планета семья" прапануе чытачам нізку вершаў паэтэсы Таццяны РУДЭНКА, дзе чырвонай ніткай проходзяць светлыя і ўсхваляваныя пачуцці да маці...

Пишите письма матерям

Пишите письма матерям,
Они же ждут, они страдают!
Не огорчайте ваших мам,
Они от горя увядают.
Дороже мамы только жизнь,
Дороже жизни только мама.
Ты за любовь её держись
И береги её от драмы.
Пишите письма матерям,
Хоть пару строк своей рукою.
Не забывайте ваших мам,
Дарите им глоток покоя.
Не поскупитесь на любовь,
Пусть душу матери согреет.
Пишите письма вновь и вновь,
Слова ведь многое умеют.

Таццяна Рудэнка

№ 3, 2008 г.

Таццяна ШАМЯКІНА.

Парадоксы нашага жыцця.

...Беларускі народ -- адзін з самых няшчасных у гісторыі. Але я веру ў нейкую Вышэйшую Справядлівасць - у дачыненні не толькі да асобнага чалавека, але і краіны, народа, чалавецтва. Глыбока ўпэўненая, што Беларусь, будучы некаторым сакральным цэнтрам ва Ўсходняй Еўропе, працяглы час існавала як *эдэм*, як тэрыторыя шчасця. Тут, у нашых лясах і балотах, знаходзілі паратунак плямёны, якія беглі ад захопнікаў, што прыходзілі з Усходу. З іншага боку, пасылаючы выпрабаванні Беларусі на працягу яе гісторыі, Бог, магчыма, рыхтуе нас да яшчэ большых няшчасцяў, якіх не вытрымаюць заходнія еўрапейцы і амерыканцы, разбэшчаныя спажывецкай цывілізацыяй, прычым за кошт іншых. А вытрымаем мы, загартаваныя сваёй прыродай і гісторыяй.

Таццяна Шамякіна

♥ *8 кастрычніка 2008 года Таццяна Іванаўна Шамякіна адзначае 60-годдзе. Віншуем яе з Юбілеем і зычым усяго найлепшага!*

10.10.2008 г.

● Доказано, что дольше живут потомки родителей, которые сами прожили более 80 лет. А наибольшему риску подвергаются дети (особенно девочки), родившиеся в семьях, где отцы были уже в возрасте.

● Женщин - долгожительниц объединяет один факт биографии: они, как правило, рожали поздно, после 40. Отсюда вывод: поздняя менопауза способствует долголетию. Когда исследовали семьи британских аристократов, то обнаружили, что две трети женщимн, умерших молодыми, были бездетными.

● Японцы давно вывели формулу долголетия -- 10 тысяч шагов в день, или 5 км одномоментно в любом возрасте. Низкокалорийное питание -- тоже не общая рекомендация. В своё время геронтологов немало удивляло, что среди белорусских долгожителей много бывших узников концлагерей. Они доживали до 90 лет гораздо чаще. То есть более стойкими оказывались те, кто недоедал. Кроме того, питание должно соответствовать тем кулинарным традициям, которые складывались у нации тысячелетиями. Грубо говоря, мусульманину сало вредно, а белорусу -- нет.

Цытата

Лепш быць ільвом адзін дзень, чым шакалам усё жыццё.

Элізабет Генры.

Народная газета

СЯКЕРА.



► Жанчыне, асабліва цяжарнай, забаранялася без нагоды браць у рукі сякеру, каб не справакаваць нараджэнне дзіцяці з рассечанымі, г.зн. "заечымі" вуснамі.

► Жанчыне, якая збіралася яшчэ нараджаць дзяцей, забаранялася секчы галаву курыцы -- гэта павінен зрабіць мужчына.

► Сякеру забаранялася прыносіць у хату ў той момант, калі рыхтавалі рошчыну ці калі хлеб стаяў у печы -- у такім выпадку хлеб "няўдалы будзе". Лічылася, што парушэнне гэтых забаронаў можа выклікаць негатыўныя наступствы ў хаце: будзе біцца посуд, не расцеліцца карова і г.д.

► Сякера, як і іншыя вострыя рэчы (нож, серп, іголка), была абярэгам хаты ад нячыстай сілы і чалавека з дрэннымі намерамі.

Аргументы и факты

Анатолий Приставкин

«...Жестокость нравов у народов – в исторической крови. В России цена человеческой жизни всегда была – полушка. Что при Петре, что при Иване Грозном, что при Сталине. А уж унизить человека, растоптать его достоинство – это вообще ничто. Если уж у нас одного из спасителей России, князя Пожарского, за долги запрягали в оглобли, то что же говорить о простом человеке».

Прозвішча падпісчыка

Калі родны чалавек пайшоў з жыцця...

Фота М.Яцкова

- У першыя тры дні пасля смерці чалавека не выносяць з хаты ніякіх рэчаў.
- На дзевяты дзень пасля смерці сваякі ідуць у храм, заказваюць жалобнае набажэнства, дома наладжваюць другі жалобны стол. За першы жалобны стол сям’я памерлага не сядала. На дзевяты дзень усё адбывалася наадварот: за стол сядала сям’я і яшчэ дзевяць чалавек (па трое: хто мыў нябожчыка, хто рабіў труну, хто капаў магілу).
- На 40-ы дзень пасля смерці чалавека ладзяць трэці жалобны стол -- “саракавіны”, на якім прысутнічае сям’я памерлага, сваякі, блізкія, сябры, калегі па рабоце. У царкве заказваюць Саракаўст -- сорак літургій.
- З дня пахавання і да 40-га дня, калі ўзгадваем імя памерлага, мы павінны сказаць сімвалічнае жаданне: *“Зямля яму пухам!”*, тым самым выказваем пажаданне, каб душа яго лёгка апынулася на нябёсах.
- Пасля 40-га дня і на працягу трох наступных гадоў мы павінны казаць: *“Царства яму нябеснае!”* Тым самым мы жадаем памерламу пасмяротнага жыцця ў раі. Словы гэтыя павінны быць адрасаваны любому памерламу, незалежна ад абставін яго жыцця і смерці, кіруючыся пры гэтым біблейскім запаветам “Не суди, да не судим будешь”.

(Заканчэнне будзе)

Марыя Мікалаеўна СЕЛЮКОВА (1923-2008)

24 верасня 2008 года на 86-м годзе жыцця памерла Марыя Мікалаеўна Селюкова.

Нарадзілася яна 1 ліпеня 1923 года ў вёсцы Малееўка ў дружнай і працавітай сям’і Мікалая і Аксінні Селюковых. Як і ўсе вясковыя дзеці, з маленства прызвычаілася да руплівай сялянскай працы і пранесла гэтую адданасць праз усё жыццё. Бачыла, як утваралася новае калгаснае жыццё і прыклала нямала сіл, вопыту і намаганняў, самааддана працуючы на калгасных палетках.

У гады ваеннага ліхалецця Марыя Мікалаеўна звязала свой жыццёвы лёс з Іванам Яфімавічам Панятоўскім, але нядоўгім было шчасце: у 1944 годзе Іван пайшоў на фронт і загінуў, захінаючы Айчыну. І ніколі ўжо не спазнаў, што на свет з’явілася яго кравіначка -- сын Дзмітрый. А Марыя Мікалаеўна ўжо нікому не аддала сваё сэрца, памятаючы сонечныя імгненні такога кароткага шчасця...

А жыццё спявала сваю непаўторную песню, і былі ў гэтым гучанні і радасныя, і сумныя ноткі. І калі ў свет пайшлі трое ўнукаў і двое праўнукаў, то Марыя Мікалаеўна з палёгкай зразумела, што жыццё не спыніцца ніколі.

І, пакінуўшы нас, яна назаўжды засталася ў нашай памяці.

АДНАВЯСКОЎЦЫ.

Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь для жыхароў Брылеўскага рэгіёна і наваколля.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 299 асобнікаў.

Адрас для карэспандэнцыі:
213107 Магілёўскі раён п/а Брылі
тэл. маб. +375293732886
e-mail: brylibelarus@gmail.com
© “Брылеўскі летапіс”, 2008

Заснавальнік і рэдактар
Мікола ЯЦКОЎ